ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.24 (3050) ● ЧАЦВЕР, 28 чэрвеня, 2007

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Розум — гэта капітал Стар. 2

Знічкі Айчыны Стар. 3

Чыстыя крыніцы роднай мовы Стар. 4

“Гэта не толькі ганарова, але і адказна”

Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір Пракапцоў стаў членам Расійскай акадэміі мастацтваў

Кацярына Немагай

Урачыстая цырымонія надання адбылася ў Маскве і была прымеркавана да 250-годдзя з дня заснавання акадэміі. Акадэмічныя мантыі і іншыя ганаровыя рэгаліі былі ўручаны таксама прадстаўнікам Японіі, Францыі, Харватыі, Украіны і расійскім рэжысёрам Мікіту Міхалкову і Юрыю Любімаву.

Акрамя Уладзіміра Пракапцова, беларускімі членамі Расійскай акадэміі мастацтваў з’яўляюцца народныя мастакі СССР Міхаіл Савіцкі і Георгій Паплаўскі. Раней членамі акадэміі былі выдатныя беларускія дзеячы мастацтваў Заір Азгур і Яўген Зайцаў.

“Статус акадэміка надае вагу не толькі мне асабіста, але ўвогуле Нацыянальнаму мастацкаму музею Беларусі, — падзяліўся думкамі новы член Расійскай акадэміі мастацтваў. — Гэта не толькі ганарова, але і адказна”.

Уладзімір Пракапцоў адзначыў, што ў апошнія гады значна актывізавалася беларуска-расійскае супрацоўніцтва як у цэлым у сферы культуры, так і ў вобласці выяўленчага мастацтва. Беларускія прыхільнікі жывапісу і скульптуры ўжо змаглі пазнаёміцца з работамі Зураба Цэрэтэлі, Аляксандра Шылава, Васіля Несцярэнкі, Яўгена Сідарава, персанальныя выставы якіх не так даўно праходзілі ў Беларусі. А ў наступным годзе ў Мінску плануецца паказаць творы Іллі Глазунова.

“Важна, каб беларускі глядач знаёміўся з лепшымі творамі, якія захоўваюцца ў музейных фондах Расіі, і лепшымі ўзорамі творчасці расійскіх мастакоў, — сказаў Уладзімір Пракапцоў. — Прыемна, што Расійская акадэмія мастацтваў і цяпер працягвае тыя вялікія традыцыі, што былі назапашаны ёю за 250-гадовую гісторыю існавання”.

Расійская акадэмія мастацтваў з’яўляецца адной з старэйшых дзяржаўных устаноў Расіі. Ідэю стварыць яе выказваў яшчэ Пётр Першы ў канцы XVII стагоддзя, аднак пабудавана акадэмія была толькі ў 1757 годзе яго дачкой імператрыцай Лізаветай. Ля вытокаў стварэння акадэміі стаялі вялікі рускі вучоны Міхайла Ламаносаў і куратар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта асветнік Ян Шувалаў. У XVII-XIX стагоддзях акадэмія вызначала развіццё рускага выяўленчага мастацтва і архітэктуры. Не меншае значэнне яна мела і для мастацтва XX стагоддзя, захоўваючы яго традыцыі і выхоўваючы пакаленні выдатных мастакоў. Сёння Расійская акадэмія мастацтваў аб’ядноўвае ўсе лепшыя творчыя сілы Расіі. Яе ўзначальвае народны мастак СССР, уладальнік мноства ўзнагарод і прэмій, славуты скульптар Зураб Цэрэтэлі.

ГЕОРГІЙ ШАБЛЮК

Уладзімір Пракапцоў да справы падыходзіць творча

ВЕСТКІ

Суседства абумоўлена адкрытасцю

Ірына Цімохіна

На беларуска-літоўскай мяжы прапануецца адкрыць дванаццаць пунктаў спрошчанага пропуску

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу прагаласавалі за праект закона аб прыняцці пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Літоўскай Рэспублікай, які прадугледжвае ўнясенне змяненняў у дагавор аб пунктах пропуску праз дзяржаўную мяжу.

Як паведаміў першы намеснік старшыні Дзяржкамітэта пагранічных войскаў Беларусі Вадзім Зайцаў, пасля ўступлення ў сілу гэтых паправак да дзеючага пагаднення на беларуска-літоўскай мяжы будуць дзейнічаць дванаццаць пунктаў спрошчанага пропуску.

Будучы дакумент таксама дасць магчымасць добраўпарадкаваць і мадэрнізаваць старыя пункты пропуску, скараціць колькасць нерэнтабельных чыгуначных прапускных пунктаў, захаваць інфраструктуру міждзяржаўных пунктаў пропуску за кошт пераводу іх у статус спрошчаных.

Напрыклад, у адпаведнасці з папраўкамі да пагаднення колькасць чыгуначных пунктаў скарачаецца з сямі да двух. У той жа час прадугледжана адкрыццё рачнога сезоннага пункта пропуску.

Плошча для сталіцы Казахстана

Аналаг мінскай плошчы з падземным гандлёвым цэнтрам хутка з’явіцца ў сталіцы Казахстана. Прадпрыемству “Мінскпраект”, які распрацаваў праект рэканструкцыі плошчы Незалежнасці ў беларускай сталіцы, паступіў заказ на прыданне новага аблічча цэнтральнай плошчы ў Астане. Спецыялісты прадпрыемства працуюць цяпер над падрыхтоўкай праекта добраўпарадкавання цэнтральнай плошчы казахстанскай сталіцы і будаўніцтва падземнага гандлёвага цэнтра з двума паркінгамі, расказаў галоўны спецыяліст “Мінскпраекта” па архітэктуры і горадабудаўніцтву Міхаіл Гаўхфельд.

Мова як мост да Паднябеснай

Студэнтка Беларускага дзяржаўнага універсітэта прадставіць сваю краіну у фінале міжнароднага конкурсу па кітайскай мове ў Пекіне

Вольга Кісялёва

Пяцьдзесят краін свету прымуць удзел у фінале VI Міжнароднага конкурсу студэнтаў “Кітайская мова — мост”. Ён адбудзецца ў Пекіне 3-13 жніўня.

Беларусь прадставіць пяцікурсніца факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта Анастасія Сямашка, якая стала пераможцам адборачнага тура гэтага прэстыжнага міжнароднага спаборніцтва. Мерапрыемства было арганізавана пасольствам КНР у Беларусі пры падтрымцы Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта.

Як паведаміў другі сакратар па справах адукацыі пасольства КНР у Беларусі Бэй Вэньлі, у сталіцу Паднябеснай на фінал конкурсу прыбудуць каля 100 удзельнікаў. Іх чакае цікавае спаборніцтва, на якім можна будзе бліснуць ведамі ў галіне кітайскай мовы, культуры, гісторыі, філасофіі. Студэнты змогуць таксама прадэманстраваць свае таленты, выконваючы кітайскія танцы і песні.

Пераможцаў конкурсу чакаюць узнагароды — стыпендыі пры навучанні ў КНР, а таксама стажыроўкі ў гэтай краіне, прысуджэнне ганаровага звання “пасланнік кітайскай мовы”.

Розум — гэта капітал

Перадача “Разумнікі і разумніцы” на адным з расійскіх тэлеканалаў гэта інтэлектуальная віктарына, прыз у якой — не толькі сімвалічны капітал у выглядзе захаплення ў вачах аднагодкаў, але і залічэнне ў шэрагі студэнтаў Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін. А які выпускнік не марыць трапіць ва універсітэт, ды яшчэ ў такі прэстыжны?

Ганна Бандарчук

— Мне вельмі пашчасціла. Я некалькі разоў быў на мяжы вылету з перадачы, — дзеліцца ўражаннямі сёлетні пераможца перадачы “Рпазумнікі і разумніцы” вучань Ліцэя Беларускага дзяржаўнага універсітэта Яўген Мядзведзеў. — Я падлічыў: конкурс на перамогу быў 17 чалавек на месца. Трэба было рызыкаваць. Мяне выратаваў спартыўны азарт. Яшчэ дапамагло тое, што я пяць гадоў гуляў у “Што? Дзе? Калі?” Прычым, прывык гуляць доўга. Калі ўсе ўжо марылі толькі аб сне ў гатэлі, я толькі разгульваўся.

Беларусы ў “Разумніках і разумніцах” перамагаюць ужо другі год. Летась студэнтам МДІМА стаў Іван Кебец, які таксама быў выпускніком Ліцэя пры Беларускім дзяржаўным універсітэце.

— Спадар Вяземскі, вядучы перадачы, смяецца, маўляў, мацнее беларуская дыяспара. Так што і ў наступным годзе беларусаў чакаюць. Трэба не падкачаць! А Ваню я ведаю асабіста, мы з ім разам стратэгію перамогі распрацоўвалі. Я падумаў: і ў мяне ёсць шанцы, — прыгадвае Яўген.

Перамагчы беларускаму разумніку дапамаглі шырокі кругагляд (у ліцэі Жэня вучыцца ў гістарычным класе) і добрая памяць (перадача была юбілейная, задавалі пытанні апошніх 15-ці гадоў).

— Найлягчэйшыя пытанні для мяне былі на логіку. Напрыклад, як можна растлумачыць факт, што іспанская правінцыя Андалузія кіравала рымскай імперыяй з канца II стагоддзя нашай эры? Усе рымскія імператары былі родам адтуль. А самыя складаныя пытанні — на вузкаспецыяльнае веданне.

Аднакласнікі павіншавалі Яўгена з перамогай і зрабілі яму калектыўны падарунак (які — Жэня папрасіў пакінуць у сакрэце). Але поспеху таварыша не зайздросцяць: з 22 чалавек у класе сем перамаглі ў рэспубліканскіх алімпіядах і паступілі на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, адзін паедзе вучыцца ў Галандыю. Сам Жэня — ужо студэнт Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін — будзе жыць у маскоўскім інтэрнаце на стыпендыю і вучыцца на факультэце права.

WWW.KP.BY

Ліцэіст Яўген Мядзведзеў задаволены ацэнкай сваіх ведаў

Час дыктуе змены

Уладзімір Дарашэвіч

Павільён “Беларусь” адкрыецца ва Усерасійскім выставачным цэнтры (былая Выстава дасягненняў народнай гаспадаркі) у 2008 годзе.

Беларускі павільён, які дзейнічаў на Выставе дасягненняў народнай гаспадаркі з 1953 года, быў адным з самых прыгожых. Ён уражваў наведвальнікаў сваёй веліччу: скульптурамі, мазаічнай падлогай, калонамі з арнаментам.

У 2005 годзе новае кіраўніцтва Усерасійскага выставачнага цэнтра і Міністэрства гандлю Беларусі вырашылі аднавіць страчаныя сувязі. Тады і была пастаўлена задача вярнуць павільёну першапачатковы выгляд. Па фатаграфіях былі нанава створаны мазаічная падлога ў выглядзе нацыянальнага ручніка, трох’ярусныя свяцільні і арнамент на калонах. Фасад павільёна ўпрыгожыць герб краіны.

Да канца гэтага года запланавана аднавіць шкляную прыбудову, у якой размесцяцца офісны цэнтр, прадстаўніцтвы беларускіх прадпрыемстваў і магазін сувеніраў. А ў 2008 годзе ўжо ў самім павільёне пачне працаваць экспазіцыя беларускіх вытворцаў. Тут будуць праходзіць таксама тыдні абласцей Беларусі, нацыянальныя святы, выставы-продажы лепшых тавараў: ад тэкстылю да сельскагаспадарчай тэхнікі.

Ад Берліна — цераз Мінск — да Ніжняга Ноўгарада

Уладзімір Дорахаў

Чыгункі Беларусі, Германіі, Польшчы і Расіі створаць сумесную лагістычную кампанію “Еўразія Рэйл Лагістыкс”. Адпаведныя дакументы падпісаны на 70-й сесіі Генеральнай Асамблеі Міжнароднага саюза чыгунак.

Стварэнне такога сумеснага прадпрыемства неабходна для павышэння якасці транспартных паслуг і павелічэння аб’ёмаў перавозак у рамках міжнароднага транспартнага калідора “Берлін — Варшава — Мінск — Масква — Ніжні Ноўгарад”. Аптымізацыя працэсу перавозак грузаў будзе дасягнута за кошт укаранення адзіных перавозачных дакументаў, развіцця інфармацыйнага абмену паміж чыгункамі, а таксама за кошт скарачэння страт часу і рэсурсаў на тэхналагічных стыках чыгунак.

Пра што расказала казачная аблачынка

Ірына Цімафеева

Вучні майстра Вячаслава Дубінкі з Чачэрскага раёна прыдумалі казку і самі ж зрабілі ілюстрацыі-выцінанкі да яе. А галоўным героем гэтай казкі стала воблака, якое з’явілася над Чарнобылем пасля аварыі.

Выставу «Раскажы, аблачынка», якая прыехала ў сталіцу з Чачэрскага раёна, можна паглядзець у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі.

Яна арганізавана ў рамках міжнароднага праекта, які мае на мэце супрацоўніцтва дзеля рэабілітацыі ўмоў жыцця ў пацярпелых ад катастрофы раёнах. Удзельнікамі праекта сталі школьнікі з 10 краін свету.

Усе яны стваралі сваю казку на зададзеную тэму пад кіраўніцтвам прафесійных майстроў. У Чачэрскім раёне з дзецьмі займаецца Вячаслаў Дубінка, член Саюза майстроў народнай творчасці Беларусі.

Ён быў адным з першых, хто ў сярэдзіне шасцідзесятых адрадзіў унікальны від мастацтва выразання з паперы. Яго выцінанкі атрымлівалі прэміі на прэстыжных міжнародных конкурсах.

КНІГАРНЯ

Калі душа душу перакладае...

«Любить би вічно...» — так называецца зборнік перакладаў вершаў вядомага беларускага паэта Алеся Пісьмянкова на ўкраінскую мову, які ўбачыў свет у выдавецтве “Дыксэнд” (Мінск). Аўтар перакладаў — украінскі пісьменнік Валерый Стралко.

Наталля Супей

Блізкасць дзвюх усходнеславянскіх моваў у каторы раз дапамагла працягу беларуска-украінскіх літаратурных узаемаадносін. Свет твораў Алеся Пісьмянкова пасля гэтага зборніка са сваёй асаблівай шчырасцю праз мастацкія вобразы Валерыя Стралко стаў даступным і для ўкраінскіх чытачоў.

Светлыя вобразы вяскоўцаў-землякоў, бацькоў, каханай з першатвораў А. Пісьмянкова лёгка прачытваюцца ў перакладах. Перад вачыма чытача з’яўляюцца дзед Варфаламей (“Дар”), стары конюх (“У відставці”), баба Алена (“Чиста балада”), паштар Іван Птушка (“Чиста балада”), каханая Алена (“Мій сад, заметистий силенно...”), маці (“Мама”, “І відра, сповнені води...”), бацька (“Ностальгія по ідилії”). За кожным вершам — багатая і чулая душа аўтара. І ў перакладах яна не знікае. У перастварэнні В. Стралко нібы пералілася моцная энергетыка з твораў беларускага паэта.

Аўтар першатвораў, якога ўжо няма ў жывых, вельмі адчуваў хуткаплыннасць жыцця, таму марыў: “Мне б наслухацца зязюлі, мне б забыць пра крумкача...” Сталасць для яго, нібы позняя восень, калі “... плачам сэрца раніла журавоў страла...” І з пазнейшага верша, дзе ўжо ёсць прадчуванне апошніх дзён: “Кажуць, што ў сорак садзішся на “скоры”, што йдзе да апошняй станцыі “Пожня” Пэўны трагізм гэтых радкоў змяншаецца, дзякуючы менавіта глыбокаму вобразу “пожні” — так паэт сведчыць не пра скон, а пра час падрахоўвання вынікаў жыццёвага шляху. На ўкраінскай мове В. Стралко дасканала перадае гэтыя адчуванні беларускага аўтара.

Быў і застаўся ў паэта сэнс жыцця — любоў. Любоў да малой радзімы і бацькоў, любоў да Беларусі. Менавіта з верша “Вада. На строме сосны...” ўзяты радок для назвы зборніка перакладаў: “Любіць бы вечна гэты край.// Журботны. Родны. Росны.// Любіць высокія аблокі, ад гора горкую зямлю...// Я не памру, пакуль люблю.”

Адчуваючы жыццё ва ўсіх праявах, любячы яго, А. Пісьмянкоў вандраваў па ім ад свайго вясковага дзяцінства да сталасці. А ў выніку паўстаў любімы паэтам вобраз Радзімы. На пачатку гэта — успаміны з дзяцінства, “някідкі краявід”... Вельмі яскравы вобраз узнікае перад чытачамі ў радках з апошняга верша зборніка (“Я прыеду, я вярнуся...”): “Белы бусел — мой задумлівы сааўтар”. Вобраз бусла успрымаецца як вобраз-сімвал Беларусі.

Нібы падвойнае святло сыходзіць ад вобразаў з вершаў зборніка перакладаў, бо на ўкраінскай мове яны — тонкія адбіткі з першатвораў.

Доказ таго, што светаўспрыманне двух паэтаў вельмі блізкае — у захаванні рытмікі, дакладнай перадачы лексікі, вобразнасці беларускіх вершаў на ўкраінскай мове. Сапраўды, ствараецца ўражанне, што адна душа перакладала другую, родную ёй душу... У выніку ўзнік зборнік, які пакідае светлае ўражанне.

На светлы ўспамін...

Штораз па дарозе на Гомель, мінаючы Бабруйск, згадваю імёны многіх і многіх ураджэнцаў старажытнага паселішча, славу якога звычайна атаясамляюць толькі з дзевятнаццатым-дваццатым стагоддзямі. Хаця, калі зрабіць грунтоўны гістарычны экскурс, славутасцяў у гэтым краі заўсёды хапала. І ў Бабруйску, і на Бабруйшчыне… Дарэчы, першае пісьмовае ўпамінанне пра Бабруйск (летапісны Бобровск, Бобруеск, Бобрусек) адносіцца да 1387 года. З 1565 года горад — у Рэчыцкім павеце, цэнтр староства. Меў горад і магдэбургскае права. У XIV — XVIII стагоддзях цэнтрам абароны горада з'яўляўся Бабруйскі замак. Уезд і выезд з горада ажыццяўляўся праз чатыры брамы: Падольную — вяла да парома праз Беразіну і далей на Магілёў, Свіслацкую — у мястэчка Свіслач, Кісялёўскую — у паўднёва-заходняй частцы Бабруйска, Прудовую — да дарогі праз плаціну на Бабруйцы і да зарэчных агародаў, сенажацяў, прыналежных гараджанам.

Бабруйск. Рынак. Пач. XX ст.

Знічкі Айчыны

Алесь Карлюкевіч

Бабруйск. Рака Бяроза. Прыстань. Пач. XX ст.

…Цяпер не так і проста ідэнтыфікаваць тую мясцовасць з сучаснымі бабруйскімі забудовамі. А тут жа дзесьці некалі бегаў пісьменнік і драматург Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. У 1824 годзе будучы літаратар і тэатральны дзеяч скончыў павятовае вучылішча ў Бабруйску. Таму і не выпадковым падаецца той факт, што Магілёўскаму абласному тэатру драмы і камедыі, што працуе ў Бабруйску, прысвоена імя Дуніна-Марцінкевіча. А ў 1997 годзе каля будынка тэатра быў устаноўлены бюст пісьменніка. У бабруйскай вёсачцы Сычкава пра аўтара неўміручай камічнай оперы "Ідылія", ды камедыі "Пінская шляхта" нагадвае мемарыяльная дошка. Чаму ў Сычкава? Ды поруч жа, за колькі кіламетраў — радзіма "Дудара беларускага": колішні фальварак Панюшкавічы.

…Згадаўшы пра Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, у каторы раз падумаў пра тое, што Бабруйск, Бабруйшчына багатыя на літаратараў, мастакоў, акцёраў, дзеячаў культуры. Амаль што па памяці цытую невялікі ўрывачак з кнігі Ніны Барысаўны Ватацы "Шляхі", з невялікага томіка, які важу за сабою ажно з далёкага ашхабадскага часу, з сярэдзіны 1980-х… Тады кніжачку мне ў спякотны каракумскі край даслала сама бібліёграф — з лаканічным і цёплым дарчым надпісам. Але ж — цытата пра бабруйчан: "У 1930 г. я скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт і пачала працаваць у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР. У той час яна яшчэ не насіла імя У.І.Леніна. Тут я і сустрэлася з суседкай па Касцельнаму тупіку Юліяй Восіпаўнай Бібілай — першай загадчыцай Аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР.

У бібліятэцы Юлія Восіпаўна працавала з 1921г. Да гэтага часу была супрацоўніцай Бабруйскай гарадской бібліятэкі, дзе арганізавала першы ў рэспубліцы Аддзел краязнаўчай літаратуры. Калі стваралася першая буйная бібліятэка ў рэспубліцы пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, дырэктар бібліятэкі І.Б. Сіманоўскі, сам бабруйчанін, запрасіў Бібілу на пасаду загадчыка аддзела…" Прызнацца, мяне заўжды парывае запытаць у бабруйчан, а ці ёсць у горадзе вуліца Сіманоўскага ці вуліца Бібілы. Ведаю, што пакуль няма. А між тым, абодва яны — выключнага таленту арганізатары бібліятэчнай справы, асобы, якія далі, падказалі накірунак дзейнасці многім наступнікам. І без іх кнігазнаўчай руплівасці, відаць, не адбылося б многіх адкрыццяў у гуманітарных навуках Беларусі.

Дык можа землякі ўлічаць заслугі Бібілы, Сіманоўскага і праз гарадскую тапаніміку ўшануюць іх плённую працу?..

А мы тым часам згадаем іншыя славутыя імёны. Часты госць у бабруйскай старонцы — паэт Мікола Аўрамчык. Увогуле мне часам становіцца шкада, што пра Міколу Якаўлевіча згадваюць усё радзей і радзей. Паэт ад Бога! Палітра мастацкіх сродкаў Міколы Аўрамчыка настолькі шматгранная, што не перастаеш здзіўляцца, як такое багатае засваенне сусветнай паэтычнай культуры аказалася пад сілу аднаму майстру. Нездарма Мікола Якаўлевіч шмат і перакладаў: Байрана, Лесю Украінку, Івана Франка, Адама Міцкевіча… Дарэчы, з літаратурнай біяграфіяй Бабруйска звязана цэлая плеяда паэтаў, празаікаў, літаратуразнаўцаў. У лістападзе 1918 года ў горадзе пачала выходзіць газета "Камуніст" (заснавана была як "Известия Бобруйского революционного комитета (ревкома)". І так склалася, што вакол яе на ўсю моц кіпела літаратурнае жыццё. У 1925-1930 гады адказным сакратаром газеты працаваў Міхась Лынькоў. Працавалі і друкаваліся ў "Камунісце" Васіль Вітка, Сяргей Грахоўскі, Рыгор Лынькоў, Мікола Лобан, Барыс Мікуліч, Хвядос Шынклер, Алесь Жаўрук, Аляксей Зарыцкі, Міхась Скрыпка, Яўхім Кохан. Пагадзіцеся, ёмістая старонка гісторы айчыннай літаратуры! У бліжэйшыя да нас гады літаратурную славу Бабруйска мацавалі і мацуюць паэтэса Святлана Басуматрава, крытык, этнограф, фалькларыст, доктар філалагічных навук Аляксей Ненадавец, празаік Анатоль Іваноў, паэт Піня Плоткін, публіцыст Мікола Давідовіч…

Калі ў Бабруйску будзе ствараццa асобны літаратурна-мастацкі музей, то ў яго экспазіцыі абавязкова знойдзе адлюстраванне жыццяпіс графіка Сямёна Дамарада. Многія яго акварэлі прысвечаны роднаму гораду — "Бабруйская прыстань", "Беларускі шынны. Будаўніцтва ЦЭЦ-2", серыі "Бабруйскі лесакамбінат", "Стары Бабруйск". У жанры акварэлі працуе яго сын — Сямён Дамарад. Вядомасць як кніжны графік атрымаў і мастак Ісаак Давідовіч (ён нарадзіўся ў Бабруйску ў 1911 годзе). У маёй хатняй бібліятэцы захоўваюцца даўно афармленыя ім кнігі "Ехаў казачнік Бай" і "Казкі. Легенды" Максіма Танка. З маладзейшых мастакоў-бабруйчан — жывапісец Эдуард Белагураў. Нарадзіўся ён у лістападзе 1947 года. Многія партрэты, карціны таленавітага майстра знаходзяцца ва ўласнасці Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі у Мінску.

І гэтыя драбнічкі — толькі малая доля мастацкай памяці Бабруйска. Будзем спадзявацца, што цалкам яна будзе ўвасоблена ў новым і багатым музеі! Мары для таго і нараджаюцца, каб быць спраўджанымі!..

© В поисках утраченного Паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава

Бабруйск. Вакзал. Пач. XX ст.

Бабруйск. Гасцініца "Беразіна". 1918 г.

Бабруйск. Крэпасць. 1918 г.

Чыстыя крыніцы роднай мовы

Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі “Маладзечна-2007” быў прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа і Янкі Купалы

Наталля Шчасная

З натхненнем выступалі этнаграфічныя калектывы на фестывалі ў Маладзечне

Гэта было свята прыхільнікаў беларускасці. Бо і песні, і музыка, і вершы, і нават творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на святочным кірмашы — усё тут было з нацыянальным каларытам. У адзін з самых знакамітых райцэнтраў Міншчыны — на творчую сустрэчу з яго жыхарамі і гасцямі — прыехалі вядомыя беларускія паэты і кампазітары: Раіса Баравікова, Леанід Дранько-Майсюк, Віктар Шніп, Эдуард Зарыцкі і многія іншыя. У абласным краязнаўчым музеі ў Маладзечне адкрылася сумесная выстава Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы і Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Удзельнікаў фестывалю чакала яшчэ адна цікавая падзея: Мінскі абласны драматычны тэатр, што таксама знаходзіцца ў Маладзечне, паказаў спектакль паводле купалаўскіх “Прымакоў”.

Сапраўдны ажыятаж назіраўся перад пачаткам фестывалю. Адкрылі канцэрт удзельнікі этнаграфічных калектываў Міншчыны. Іх з’яўленне ў гэты вечар на галоўнай сцэне можна лічыць знакавым. Аматарскія гурты не раз пацвярджалі тое, што крыніца народнай творчасці невычэрпная.

А вось, артыстам-прафесіяналам з кожным годам усё складаней. Вершаў, прыдатных для стварэння беларускіх песень, паведаміў журналістам мастацкі кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі, пачынальнік маладзечанскага фестывалю, Міхаіл Фінберг, становіцца ўсё менш. Але без прэм’ер фэст усё ж не абыйшоўся. Самай, бадай, прыкметнай з іх стала песня Эдуарда Зарыцкага на словы Янкі Купалы “Князь”. А выканала яе — і вельмі, дарэчы, ўдала — салістка Нацыянальнага канцэртнага аркестра Галіна Грамовіч.

У той дзень на сцэне з’явіліся і новыя, мала каму вядомыя пакуль выканаўцы. Дарэчы, пасля доўгага перапынку маэстра Фінберг вярнуўся да правядзення ў Маладзечне Беларускага нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні. Гран-пры на гэты раз атрымала зямлячка фестывалю Алеся Кулыша. Першае, другое і трэцяе месцы адпаведна ў Настассі Пагаржэльскай з Магілеўшчыны, Ірыны Вярковіч з Мінскай вобласці і Паўла Перавошчыкава з Гомельшчыны.

2009 год для маладзечанскага свята мастацтваў стане юбілейным. Міхаіл Фінберг паабяцаў запрасіць на X фестываль усіх, дзякуючы каму беларуская песня працягвае жыць. Знойдзецца на сцэне і месца для суайчыннікаў з замежжа. Маэстра прызнаўся: запрасіць творчыя калектывы беларускай дыяспары да ўдзелу ў нацыянальным фестывалі песні і паэзіі ён марыць даўно.

Песні і свята з нацыянальным каларытам

На канцэртную шоу-праграму “Купалле Ірыны Дарафеевай. Фестываль стыхій”, якая была прадстаўлена ў Мірскім замку, прыехалі госці з Расіі, Украіны, Кіпра, Турцыі, Грэцыі.

Вольга Карнеева

Купалле Ірыны Дарафеевай — гэта свята ў шырокім сэнсе

Усяго ў шоу прынялі ўдзел больш за 300 артыстаў. Гэта былі лепшыя творчыя калектывы Беларусі і выканаўцы, у тым ліку Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі, балет Святланы Гуткоўскай, балет Pops Foundations і іншыя.

Ірына Дарафеева выканала на канцэрце як папулярныя, шырока вядомыя песні, так і новыя кампазіцыі. Спявачка прадставіла песні ў дуэтах з Русланам Аляхно і народным артыстам Украіны Аляксандрам Панамаровым. Так, з Русланам Аляхно Ірына спявала напісаную для яе расійскім кампазітарам Кімам Брэйтбургам песню “Сэрца зямлі маёй”. Дарэчы, аўтар таксама стаў госцем свята. Спецыяльна для беларускай спявачкі ён напісаў яшчэ адну кампазіцыю — “Дзяўчына на беразе”, якая прагучала ў шоу-праграме.

“Купалле Ірыны Дарафеевай. Фестываль стыхій” было арганізавана Тэатрам песні Ірыны Дарафеевай сумесна з Міністэрствам культуры Беларусі і Другім нацыянальным каналам.

У хуткім часе выйдуць аўдыё- і відэаверсіі канцэрту ў Мірскім замку. Кампакт-дыск “Купалле Ірыны Дарафеевай. Фестываль стыхій “ стане не першым альбомам, выпушчаным спявачкай у гэтым годзе. У адзін з ранейшых альбомаў увайшлі песні маладога беларускага кампазітара Яўгена Алейніка на вершы Юліі Быкавай. Сёлета таксама быў выдадзены дадатковы тыраж яе беларускамоўных альбомаў “Каханачка” і “Пульс маіх хвілін”.

Ірына Дарафеева будзе ўдзельнічаць у “Славянскім базары ў Віцебску”, а затым, ужо ў чацвёрты раз, накіруецца ў гастрольны тур па гарадах Беларусі “Пад мірным небам”.

Шэдэўраў шмат не бывае

Ганна Бондарава

Да выставы, прысвечанай сакрэтам рэстаўрацыі, рыхтуюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі.

З дапамогай сучасных тэхналогій сёння можна вярнуць да жыцця нават творы мастацтва, якія ледзь захаваліся. Нездарма рэстаўратары Нацыянальнага мастацкага музея актыўна супрацоўнічаюць з інстытутамі фізікі, атамнай і малекулярнай фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Акрамя адрэстаўраваных палотнаў, скульптур, ікон на выставе будуць прадстаўлены і здымкі гэтых шэдэўраў у іх першапачатковым выглядзе. А частку адноўленых работ цяпер можна ўбачыць у экспазіцыі, размешчанай у прыбудове музея.

Антарктыда адкрывае свае таямніцы

Уладзімір Сцяпанаў

Выстава “Антарктыда. Першыя крокі беларускіх даследчыкаў” адкрылася ў Дзяржаўным музеі прыроды і экалогіі. Аснову экспазыцыі склалі фатаграфіі, мінералы, узоры палярнага экіпіравання. Дарэчы, у гады савецкіх даследаванняў Лядовага кантынента там працавалі каля сотні прадстаўнікоў нашай краіны, большасць — супрацоўнікі Рэспубліканскага гідраметэаралагічнага цэнтра. А з мінулага года беларускія палярнікі зноў сталі прымаць удзел у асваенні Антарктыды. Магчыма, не за гарамі той дзень, калі нашы суайчыннікі пачнуць уласныя даследаванні гэтага загадкавага кантынента.

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290—60—11
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб’ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 2000
Заказ: 710
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2007